**Карпекін, К.** Самая старажытная / К. Карпекін // Сцяг Перамогі (Лёзна). – 2009. – 19 снеж. – С. 3.

# САМАЯ СТАРАЖЫТНАЯ

**Вёска Пагосцішча славіцца тым, што тут у 1527 годзе была пабудавана самая старажытная царква на Лёзненшчыне. Традыцыі хрысціянства падтрымліваліся на працягу многіх стагоддзяў. Аж да 1930 г. збіраліся ў храме праваслаўныя з Пагосцішча і блізкіх вёсак.**

Зразумела, то быў не адзін і той жа будынак. Святар і вернікі даглядалі сваю царкву, але калі яе ўжо проста немагчыма было адрамантаваць, на яе месцы ўзводзіўся новы храм. Апошняя царква была пабудавана ў гонар Уздзвіжання Крыжа Гасподняга.

У Дзяржаўным архіве Віцебскай вобласці сярод іншых папер захаваўся план пагосцішчанскай царквы. Паводле яго, храм размяшчаўся ля самай дарогі з Крынак на Стасева, даўжыня яго дасягала 23,5 м, шырыня – 8,5 м. Царква, верагодна, была драўлянай.

Крыжаўздзвіжанская царква мела ўласную пячатку, якой святар завяраў выпіскі з метрычных кніг, лісты і іншыя дакументы. На гэтай пячатцы змяшчалася абагуленая выява праваслаўнага храма і надпісы «ОРШАН. УѢЗ. С. ПОГОСТИЩА. КРЕСТОВОЗДВИЖЕН. ЦЕР.» і «ВИТЕБСК. ЕПАРХ.». Пры расшыфроўцы і перакладзе на беларускую мову яны будуць гучаць як «Аршанскага павета сяла Пагосцішча Крыжаўздзвіжанская царква» і «Віцебская епархія».

Першапачаткова савецкая ўлада не замінала дзейнасці царквы. Адзінае, што мясцовыя ўлады паіменна перапісалі ўсіх прыхаджан (у 1923 г. іх налічвалася 72). А затым штогод прымушалі рэгістравацца: маўляў, калі не будзеце прыносіць свой статут, спісы вернікаў і святароў, зачынім царкву і ўсё тут.

Дарэчы, святаром у пагосцішчанскай царкве быў Шабуніа Сяргей Антонавіч. Яму дапамагаў псаломшчык Шабуніа Феадосій Антонавіч (па ўсёй верагоднасці, яго брат).

У рэшце рэшт, як і многія храмы Беларусі, пагосцішчанская царква была зачынена. Парадак закрыцця быў распрацаваны бальшавікамі дасканала. Высачанскі раённы выканаўчы камітэт вырашыў зачыніць царкву не проста так, а «прымаючы пад увагу невыкананне царкоўным саветам абавязкаў па дамове, хадатайніцтва насельніцтва ў 530 асоб, з якіх 125 веруючых, пра выкарыстанне будынка царквы пад клуб, адмову царкоўнага савета ад будынка царквы і адсутнасць заявы пра патрэбу ў царкве ад іншых груп веруючых». Адбылася гэта падзея 8 студзеня 1930 г. Можна нават падумаць, што райвыканкам даў праваслаўным апошнюю магчымасць адсвяткаваць у храме Нараджэнне Хрыстова.

Вось так. З царквы зрабілі клуб, а званы звезлі ў Віцебск на пераплаўку…

Гэты аповед – драбніца з 400-гадовай гісторыі пагосцішчанскай царквы. Несумненна, у будучым архіўныя дакументы раскрыюць свае таямніцы, і мы даведаемся яшчэ пра штосьці новае і цікавае.

**Канстанцін КАРПЕКІН,**
**старшы навуковы супрацоўнік**
**Дзяржаўнага архіва Віцебскай вобласці**